Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Год другі. Вильня 13 (26) апрыля 1907 г. № 15.

Цэна з перасылкою и дастаукою да хаты: на 1 г.— 3 р., на 6 мес.— 1 р. 50 кап., на 3 м.— 75 к., на 1 мес. — 25 к. Без дастауки и перасылки: на 1 г. — 2 р. 40 к., на 6 м.— 1 р. 20 к., на 3 мес.— 60 к., на 1 мес.—20 к. За границаю: на 1 г.— 4 р., на 6 мес. — 2 р., на 3 мес. — 1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

Наша Нива

Першая Беларуская Газэта з Рысунками

Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами.

Падписка прынимаецца и прадаюцца атдзельнын: нумэры газэты 1) У Кант. „Пашай Нивы“ — Завальная вулина дом № 45, 2) У Книгарни „Знанне“— Георгиески проспэкт дом № 14. 3) У Книгарни Литоускей М. Пясиикой — Шлапэлис, Доминиканская вулица дом № 13.

Адрэс рэдакціи и администраціи: **Вильня, Завальная вулица, дом № 45.**

Абъяуленія прынимаюцца на наследней страницы на 20 кап. за линейку малыми литэрами. Рукаписы и корэспондэнціи, прысланные у рэдакцию, мусяць быць чыгатэльна написаны з праудзивою фамильею и адрэсом таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падписаць прозвищэ разом з фамильею, хто незахочэ, каб была надрукована праудзивая фамилия. Адрэс и фамилия тольки для ведама рэдакціи.

Вильня 13 (26) апрыля.

Усим ведама, штб ёсць у Расеи жменя людзей, каторые называюць сябе „истинно-рускими“, а народ их кличэ „чорная сотня“. Гэтые „людзи“ цкуюць адзин народ на адзин, руских на жыдоў, ды палякоў. Силаю, гвалтам ды хитрасцью стараюцца яны пасварыць ўсе народнасьци и, прыдушыўшы кожны народ да асобку, завесьци панаване багачоў и чыноўникоў над усеми краями, што да Расеи належаць.

З рожных старон нашаго краю даходзяць весьци, што и тутака „чорные сотни“ вядуць сваю „чорную“ работу. Ашуканскими абецанками даць зямли, зацягаюць цёмных мужыкоў-беларусоў у свой „саюз“, гдзе робяць з их „истинно-руских“ людзей, а тымчасам у Думе ихные дэпутаты уселяк дабиваюцца, каб недапусциць нияких новых надзелоў.

Алеж на нашаго мужыка насели ешчэ и другие „дабродзеи“ народные: гэта „истинно-польские людзи. У Виленскай губэрни ужо у часи выбароў „працавали“ яны: сеяли сварку и ненависць меж каталіками и православными беларусами, дый уселякими непраўдами паставили на сваем. У Думу папали ад Виленской губэрни адны панынамешчыки. Паехаў туды тольки адзин мужык, ды то выбраны па трэбованню закона. Алеж и той адзин, Пелейко, стаў адразу на сторану паноў: ешчэ на выбарах у Вильни, падаў ён свой голас за памешчыцких кандыдатоў, и мужыки адрэклися ад яго; „не наш“ крычали выбарщчыки-мужыки.

Тутэйшые памешчыки— найбольш з палякоў. Вось угаварыли яны Пелейку, бытцам ён не беларус, а паляк прыродны, што не брат мужыкоў-беларусоў, а брат памешчыкоў-палякоў. — И забыўся Пелейко аб мужыках, адрокся ад усяго народу беларускаго, ад мовы бацькоў сваих... Сеў з панами и пашоў сусим пад ихнюю каманду.

У Думе народ працоўны усяе Расеи трымаецца разам: разам сядзяць имужыки, и работники, бо адни у них жаданя — адны крыудзидели. Алеж меж вашыми беларускими мужыцкими дэпутатами гэтаго нимаш: адни пайшли да „истинно-руских“, другие да „истинно-польских“ людзей. И пан Пелейко сеў з польскими дэпутатами.

У „польским коле“ ёсць або паны, або мужыки-багатыры, што за паноў цягнуць.

Народ працоўны усяе Польшчы, што не мае ничога супольнаго з „истинно-польскими“ людзьми, адрокся ад выбароў и не паслаў у Думу ни воднаго свайго дэпутата. И дзеля таго „польскае коло“ ня можэ здаволиць жаданёў нашых мужыкоў, даць „зямли и свабоды“

Ци паняў гэта Пелейко, и паны спалохалися, каб суменне у яго не загаварыла, ци проста хацели яны пацешыць Пелейку — ня ведаем. А тольки тутэйшые „истиннно-польские“ людзи патрапили навучыць кольки сотнёў каталікоў — мужыкоў беларуских, каб паслали яны „адрэс“ (лист) да пана Пилейки. Пишэцца там, што мужыки радые з свайго дэпутата, бо прылучыўся да палякоў и абъявиў сябе за паляка. И гэтые пара сотнёў каталікоў-беларусоў кажуць, што яны самы— паляки, а хоць „часам“ гавораць „по простэму“ усёж таки прыродны язык их — польски. Дзиўным выдаецпа, чаму польски язык называюць яны сваим прыродным, кали яго з роду ня знаюць. Ведама, трэба и варта кожнаму вучыцца и па польску и па руску, и яшчэ па якому, а так сама чытаць и польские, и иншые книжки, ды браць з их тое, што ёсць добрае и карыстнае. Алеж нехай паляк астаецца паляком, руски—руским, беларус —

беларусом, ды ўсе нехай жывуць у згодзи и спакою, бож ўсе людзи браты.—А ешчэ пишуць у лисьци, каб пан Пелейко стаяў за тутэйшых палякоў-каталикоў бараниў их веру и польскую народнасць. Што гэта значыць? Ци тые, што написали мужыком лист, забылися, што у Виленской губэрни ёсць и православные беларусы? Што и за православных мужыкоў трэба так сама пастаяць у Думе проци крыўдзицелёў усяго працоўнаго народу?... Ци можэ тые писаки знарок муцяць воду?... „Истинно-руские“ чорнасотенцы цкуюць православных на каталикоў, палякоў, жыдоў; а „истинно-польские“ людзи сеюць ненависць меж беларусами каталикамі и православными. Дык нехай жэ народ наш зразумее, што гэта—вораги яго! Розница меж тымі рускими и польскими „людзьми“ толькі тая, што адны цягнуць у Маскву, другие—у Варшаву, а усе разам стараюцца захапаць у свае руки цёмны народ наш ды спакойна яго абдзираць.

Польски ды расейски народ даўно раскусиў их и знаць их ня хочэ.

ГАСУДАРСТВЕНАЯ ДУМА.

Заседанне 5 апрыля.

Дэпутаты пастанавили на Вяликдзень агульных заседаннёў не рабиць: перарваць их ў сераду перад сьвятамі и адкрыць изноў цераз тыдзень па Вяликодню, ў панядзелак. Але работа тым часам не застановицца: камисии не закрываюцца и будуць працаваць и сьвятамі яшчэ з большаю силаю, бо будуць мець болей часу. А праца ў камисиях, як мы ўжо прыпаминали, бадай што важней за агульные заседання, бо ў камисиях пишуцца проекты законоў, тым часам на агульных заседаннях дэпутаты выказываюць толькі сваи погляды и жадання.

Перайшли да зямельнай справы. Першы гаварыў Петрачэнко; ён трымаўся такога погляду: Дзеля таго, што другой зямли Дума зрабиць ня можэ, то прыдзецца дзялиць тую, каторая ёсць. „Нам кажуць, што закон забараняе адбираць ад памешчыкоў зямлю. И я так думаю, што трэба трымацца закона, але як зямли у нас мала, то напишэце такие законы, каб яе стала многа и каб гэта было па закону“.

Аникин (социал-дэмократ) перш разбирае, як „правые“ глядзяць на зямельную справу. Яны, правые, думаюць, што мужыки сядзели бы циха, але их падбунтавали агитаторы. А ад такой хваробы ёсць танны рэцэпт: „агитатороў выслаць, а мужыкоў — розгами“. Затым Аникин прыводзиць, як пачалися зямельные безпарадки. Тагды мужыки не раскидали и не палили памешчыцких маёнткоў, а толькі писали прыгаворы, што зямля па-Божаму павинна належаць да их, да мужыкоў, и без ўсякаго бунту гарали панскую зямлю. Ўзнялися мужыки толькі тагды, як правицельства стало разбираць зямельную справу кулями и нагайками. А нашэ правицельства так шчыра вышло на помач памешчыкам таму, што нашы высшые чыноўники и вяликие паны-памешчыки зьлилися ў адну неразлучную истоту. „Ня толькі свабода без зямли, але и зямля без свабоды ня можэ зменшыць мужыцкай беднасьци“. Ен думе, што пры цяперашних парадках каб и дали мужыку зямли, то яму ня будзе з яе ниякой карысьци, бо яго ўсё роўна заели бы падатки, цямнота, залежнасць мужыка ад палицэйскаго вучастка и апека земских начальникоў. „Не, зямля не павинна засланяць ад нас свабоды“. — закончыў ён. — „Свабоды ад зямли не аддзелиш. Свабоды и зямли можна дабиваца не асобне, а толькі разам.“—Ўзышоў на трыбуну други социал-дэмократ Алексинский. Пачаў ён гаварыць с таго, што ў 1861 году адняли зямлю прымусам, але адняли яе не ад паноў, а ад мужыкоў для памешчыкоў, бо за паншчынай мужыки мели на адну пятую часць зямли больш, як им дали пасьля воли, и мужык, каб пражыць, павинен быў зварочваца да таго самаго панскаго двара. Тые, што бароняць панские маёнтки, гавораць, што памешчыки прыносяць народу карысць, бо вядуць сваю гаспадарку так, як кажэ навука (ўводзяць культуру) а Алексинский даводзиў, што ў 17 губэрнях ў Расеи памешчыки яшчэ и цяпер трымаюць сваю гаспадарку адработками (аб других губэрнях ён ня мае ведамасьцей), а дзеля таго, кали адбярэцца ад памешчыкоў зямля, то тым толькі падымецца культура. „Мы раскидаем, кажэ ён, гнёзды паншчыны, каторые высасываюць з мужыка апошние соки“. Доўга гаварыў ён аб тым, якой зямельнай палитыки трымаецца правицель-

ства. Кали мужыки сядзяць спакойна, то правицельства их „эксплоацируе“ (абирае), а як мужыки зачнуць варушыцца, дык ўся хитрасць правицельства идзе на тое, каб ўстрымаць их. Так и цяпер: правицельства разаслало па ўсей Расеи абъяўлення, гдзе вяликими литэрами надрукована, што ў Сыбиры мужыкам даецца дарма казённая зямля, а малюсенькими буквами ўнизу надрукована, што правицельства перад пераселенцами адвету не сябе ня бярэ. Алексинский цыфрами пацьвярдзиў, што 244 глаўных нашых чыноўникой маюць зямли 3,387,000 дзесяцин, значыць, на кожнаго з их прыходзицца каля 15,000 (пятнаццаць тысячаў) дзесяцин. Стаиць ён за тое, што зямельную справу пивинны разбираць адны мужыки, бо яны лепей за других ведаюць, чаго им бракуе. Пасьля Алексинскаго Синадино (правы) даводзиў, бытцам мужык абеднеў не ад таго, што мало маець зямли, а ад таго, што не умее яе вырабляць. Ен не дапускае и мысьли, што можна ад памешчыкоў ўзяць зямлю дарма, а кали адабраць за грошы, дык мужык николи ня здолее выплацицца.

Заседанне 6 апрыля.

Недаўно 30 дэпутатоў заявили ў Думе, што у алгачынской катаржной турме вельми катуюць палитычных арэштантоў ды здзекуюцца над ими. Дума тады адда-ла разабраць гэту справу ў камисию, и цяпер камисия абъявила свае пастанаўленне вось якое: „Як паказываюць дэпутаты, ў катаржных турмах Нерчынскай вокруги бьюць и катуюць катаржникоў, прысуджэных туды за палитычные справы. Вось, 2 марца гэтаго году з Акатуя атправили у алгачынскую турму 15 палитычных арэштантоў; як прыйшли яны у Алгачы, им прыказали перабрацца ў арэштанцкую апратку, и пры гэтым па прыказу начальника турмы Бородулина салдаты надта моцна пабили их кольбами сваих винтовак. Пасьля таго 5 марца Бородулин прывёў ў турму 60 салдатоў и приказаў изноў катаваць палитычных. Тады пабили 13 чалавек; некольки аж самлела; двох скинули за ноги з ганку на камени. Ўся падлога была залитая кроўю“. — Дзеля ўсяго гэтаго и каб не дазволиць болей катаваць людзей, камисия просиць Думу патрэбоваць ад министроў „ўнутрэных дзел“ и „юстиции“, каб абъяснили, „чы ведаюць яны аб катаваннях палитычных арэштантоў, што сядзяць у алгачынской турме, и кали ведаюць, чы зрабили што-колечы, каб палажыць канец катаванням и прыцягнуць да ответу винаватых ў гэтым?“.

Дэп. Успенски (соц.-рэв.) ешчэ болей расказывае аб здзеку над палитычными катаржниками. „Бородулин, кажэ ён, прасиў у начальника катарги Метуса дазвалення сечы их розгами. Усе баяцца за свае жыццё. — У акатуйскай турме бы-

---

ГЭДАЛИ.

5)

Апаведанне Элизы Ожэшковай.

И расказаў, як пасьля пажару и жончынай сьмерци пачаў кашляць ды слабець; але за два апошние годы яму ўсё робицца горэй ды горэй; вельми цисьнець яго нешта ў грудзёх, и таки ўжо ён безсильны, страх яки! Каб ён ня быў хворы, мог бы хадзиць хутчэй ды зарабляць барджжэй,—можэ, нават лепшы яки интэрэс прыдумаў бы сабе... Але гэта такая хвароба, што вельми силы адбираець...

Малые, шустрые вочы Карэйбы завильгатнели пад густыми брывями. Цяпер добра ён прыпомниў тую шчасьливую для Гэдаля пару, краму яго жонки и паездку ў яго будзе аж да Слонима, прыпомниў, — и ўзяў яго жаль. Сам быўшы кались бедным, Карэйба добра знаў ўсе няўзгоды беднаты дый меў яшчэ да гэтаго мягкую душу ў сваим цьвёрдым целе.

— Сухоты, ци што? — прагаварыў ў поўголаса. — Чамўж ты, лиха, ня лечшыся?

— Я быў у доктара.

— А што ж табе сказаў доктар?

— Што? Ен сказаў каб я што дзень еў мясо, пиў шмат малака, мала хадзиў дый што тыдзень ставиў банки.

И горки сьмех праляцеў па яго твары, и лоб зморшчыўся да самых сивых валасоў.

— Есьци мясо и малако пиць я не магу, бо гэта дорага... Хадзиць жэ мушу многа, бо ў гэтым мой цэлы заработак... Ну, у адным я паслухаў доктара... банки стаўлю кожны тыдзень... Яны тольки залатоўку каштуюць, ну... залатоўку на тыдзень я магу адличыць на лечэнне...

— Ах, Езус! — зьдзивилася Карэйбиха, — як жэж вы можэце хадзиць столькі хварэючы?...

Жыд перастаў сьмеяцца и сказаў:

— Ходжу!

Тым часам Ядвися, каторая выбегла на

ло 6 кабет; их пагнали ў мальцэўскую турму, — хворых, ў мароз, за 200 верстоў ад Акатуя.“ Чытаецца лист Спирыдоновой и Сазонова з катарги аб тым, якие страшэнные справы тамака робяцца. Сазонов пишэ, што ён баицца, каб яго не забили. „И ўчора, сказаў Успенски, прыйшла весць, што Сазонов ўжо пры съмерци.“ — „Цяпер, дакончыў сваю мову Успенски, ва ўсей Расеи бьюць: бьюць у турмах, у вучастках, бьюць „истинно-руские“ людзи, карацельные атрады, секуць ня гледзячы на тое, што тры годы таму назад написаны быў закон, што сечы ня можна. И Дума павинна ўзяцца за гэтую справу, хаця нима ведама, чы здолее яна дабицца чаго-колечы.“ — „Правые“ даводзили, што турэмнае начальства паступае справедлива, и Думе нима да гэтаго ниякога дзела. — Дэп. Алексински (соц.-дэм.) трабуе каб Дума зрабила „запрос“ правицельству аб катаванни палитычных арэштантоў, бо гэтым яна пакажэ, што идзе разам з народам и тыми, хто ваюе за народ.

Пастанаўленне камисии Дума уцьвярдзила за згодаю ўсих дэпутатоў.

Далей прыступили да справы аб забастоўцы ў Баку. Ад имяни камисии аб „запросах“ дэпутат Пэргамэнт сказаў, што забаставали служашчые на параходах ешчэ ў палови марца дзеля таго, каб палепшыць варунки працы. Баставали яны циха и спакойна, алеж, ня гледзячы на гэта, 30 марца быў посланы ў Баку жандармски генэрал Таўбэ з „асобными поўнамочьями“, каб зрабиць спакой. Забастоўка там пачалася спакойна, и правицельству нима ниякой патрэбы мешацца ў яе, каб не давесьци забастоўшчыкоў да безпарадкоў. — Вось и хочэ камисия. каб Дума зрабила глаўнаму министру „запрос“ таки: „дзеля чаго правицельства прызнало патрэбным пасылаць ў Баку ген. Таўбэ з асобными поўнамочьями?“.

Дэп. Афрамович (соц.-дэм.) расказаў, што забастоўка ад самаго пачатку была сусим спакойная. Работники пастанавили самы пильнаваць добро сваих гаспадароў. Яны па чародзи наглядали, каб нихто чужы ня мог папасьци на параходы. — Гаспадары ня хочуць споўниць жадання работникоў, и забастоўка не канчаецца. Дзеля таго гаспадары маюць такую думку: давесьци работникоў да незаконных паступкоў и нарушэння спакою, а тады ўжо выйдзе, што работники бунтуюцца проци правицельства, а што ад гэтаго бунту рабочаго церпяць бытцам невинна гаспадары-багачы, и правицельства, ведама, мусиць даць им сваю помач!... Дэп. Струвэ (к.-д.) гаварыў, што ад забастоўки той будзе беда для ўсяго краю, алеж само правицельства винавата тутака, бо не дае рабочым злучыцца разам, рабиць моцные саюзы, збираца на сходы, ды свабодна гаварыць. Калиб усе гэтые правы меў народ працоўны, то и без бунтоў скора мог бы ён дабицца ад гаспадароў-капиталистоў спаўнення сваих жаданнёў, и гэтая самая забастоўка ўжо скончылася бы. — А цяпер, як паслали жандармскаго генэрала, то гэта можэ яшчэ пашкодзиць. — Тое самое казали и другие дэпутаты. Дэп. Еврэинов (соц.-рэв.) даводзиў, што правицельства заўсяды стаиць за багачоў ды памагае им циснуць бедны працоўны народ.

Дума пастанавила зрабиць запрос так, як прэдлажыла камисия. Так сама пастаноўлена зрабиць ешчэ вось яки запрос правицельству: Карацельны атрад, што

нескольки минут ў сени, вярнулася з невяликим белым збанком и падышла да жыда.

— Можэ, малака хочэце? — спыталася, падаючы яму збанок.

Нават па вачох видно было, што Гэдали галодны. Але, паглядзеўшы на збанок, налиты недаўна надоеным, яшчэ цёплым малаком, ён адказаў, круцячы галавою:

— Дзякуй паненцы; мне гэтаго ня можна.

— Што? трэфна?—засьмеяўся Томкевич.

— Мне гэтаго ня можна...

— То можэ хлеба з маслам? — адазваўся Янук.

Гэдали ничога ўжо не сказаў, тольки зноў пакруциў галавой.

— Вот, зьели бы бульбы з соляю, а то аслабнеце саўсем, — запрасила Карэйбиха, пазираючы ў гаршчок, дзе было яшчэ крыху бульбы.

Ў клопоци ад ўсяго гэтаго Гедали, пазираючы ў сторану, сказаў:

— Дзякуй вельможным панам за ўсё. Ўжо я заўтра падъем у шынкара ў Шумнай.

— Ну, и жыви ж з гэтыми людзьми!— грубым басам загаласиў аканом, — кали яны нават з хрысьцианскай руки кавалка хлеба ня возьмуць, бытцам ўсё нашае для их зараза. Але, слова гонороваго чалавека! сабачая их вера! няхай их чэрци возьмуць з их „трэфами“ ды галодными бахурами разам!

— Праўды! — пацьвярдзиў Карэйба.— Прымерам, гэты: есьци ня маець чэго, лечыцца нет за што, а кали добры чалавек захочэць крыху яго пакармиць, то яму неякие забабоны скарыстаць з гэтаго не позволяць. Праз гэта чалавек, хаця и добрае мае сэрцэ, халаднеець да их...

Гэдали слухаў, схилиў пакорна голаву и цяжка ўздыхнуў. А як падняў ён голаву изноў, то на ёй видна была глубокая думка. Растаропносць сьвяцилася на яго твары. И крыху ахрыплым цихим голасам ён пачаў:

— Гэта праўда, што вельможные паны гавораць: Есць на свеце столько нешчасьця, сколько пяску ў вяликим моры. Адно нешчасьце ёсць з бяды, другое — з хваробы, трэцяе — ад сварки, а чацьвёртае з таго,

недаўна вернуўся з гор. Озургент, Кутаискай губ. (на Каўкази), трэбуе ад обчэства сега Ланчхуты 45 тысячоў руб. штрафу и не паказывае нават, за што назначэна гэта кара, вельми цяжкая для народу. Незаконны штраф дый усе несправедливые паступки и крыўды атрада могуць давесьци народ да паўстання и пралиця крыви. Чы ведае аб гэтым министэрство „унутрэных дзел“ н што мае яно рабиць, каб адмениць незаконны штраф, асвабадзиць народ ад гвалтоў и недапусциць пралиця крыви?.

У канцы заседання уцьвердзили выбары ў Тамбовскай губ. Пры гэтым паказалося, што ўсе „власьци“ паступали процизаконна, и аб гэтым пастаноўлена заявиць министру.

Праца у камисиях Гасударственай Думы.

3-го апрыля камисия аб „недаткнёнасьци“ асобы написала 3, 4 и 5 стаци новага закону:

Ст. 3. Никога ня маюць права затрымаць и пасадзиць пад арэшт, ци трасьци (абыскаць), або яшчэ як пазбавиць свабоды иначэй, як тольки па прадписаню судзебнай власьци. На гэтым прыказе павинна быць написана, каго хочуць затрымаць, за што и па якой стаци закону.

Ст. 4. Бяз трэбования аб тым еудзебнай власьци тых людзей, на каторых маюць падазрэнне, што яны зрабили яки праступак, палиция можэ затрымаць пры таких здарэннях: 1) кали чалавека злавили на мейсцу праступку, або зараз пасьля таго. 2) кали той, каму праступник зрабиў шкоду, або сьведки проста пакажуць на таго чалавека; 3) кали на тым, на каго маюць падазрэнне, або ў яго кватэры знайдзены будуць ясные сьледы праступку; 4) кали рэчы, каторые паказуюць на праступак, належаць да таго чалавека, чы знайшлися пры им.

Пры гэтым палиция можэ затрымаць каго-колечы па падазрэнню тольки тагды, кали можна чэкаць, што гакуль прыдзе судзебнае пастаноўленне той чалавек можэ уцячы.

А хацяж бы были ўсе знаки, палиция тольки тады можэць арэштаваць чалавека, кали той парываўся уцякаць або папаўся ў руки палиции ўжо уцёкшы або уцекаючы. не падаець сваго праўдзиваго прозвища ды ня можэ паказаць, гдзе жывець.

Ст. 5. Акром прыпадкоў, паказаных ў той стаци, палиция можэць арэштаваць асоб, каторые на свабодзе могуць што шкоднае зрабиць з сабою, з другими людзьми, ци пазбавили других свабоды, або нарушаюць людзки парадак.

Затрымаць асобу ня можна больш як

што чалавек ня мае розуму. Але так заўсягды ня будзе на сьвеци. Прыйдзець таки час, кали ўсенька будзе добра. А ад каго гэты час прыдзе?

Сеў проста, далони палажыў на калени и крыху падняў твар. Видаць надышла на яго добрая минута. Можэ, прыказка, каторую меў расказаць, была найлепшаю, можэ цеплата агню ды людзкая дабрата загрэли яго цела и душу.

— У нас так стаиць написана: У старым горадзи Ешурум на высоким крэсьли сядзеў ў вяликай школи вялики рабин Мойсей Бэн-Маймон, а вакол яго сядзела сто, можэ, тысяча, а можэ и дзесяць тысячоў вучнёў. Ен да их гаварыў па-арабску, пагрэцку и иначэй; бо ён быў таки рабин, што ни да воднаго народу ня меў ненависьци и гдзе тольки знаходзиў разумнаго чалавека, то прыхиляўся да яго, як бы то быў жыд. Кали ён перастаў гаварыць, падняўся з лаўки найлепшы яго вучаник, каторы зваўся Бэн-Егуда, и сказаў: „Рэбэ, ў библии я не разумею аднае рэчы! Растлумач мне, каб я яе паняў.“—„А чаго ты не разумееш?“— спытаўся Бэн-Маймон. Бэн-Егуда сказаў: „Я не разумею, хто были тые анёлы, што прысьнилися нашаму прэдку Якубу, ўзыходзячы па драбинах да неба и изноў зварочваючыся на зямлю?“ Бэн-Мэймон падумаў и пачаў гаварыць: „Гэтые анёлы, то вяликие людзи, што становяцца добрыми ды мудрыми, значыць идуць што раз выжэй, ў гору. Им трудна исьци да гары, але яны идуць, бо маюць такие силы и такие вяликие жадання, каб зайсьци туды, скуль можна набраць шмат дабраты. Няхай яны завуцца праророками, няхай вучоными, ци миласэрнага сэрца, ци проста вяликими, але ўсе яны ёсць анёлы, што ўзыходзяць да неба.“ — Так сказаў Бэн-Маймон. Але Бэн-Егуда не заспакоиўся яшчэ и пытаўся далей: — „А чаму гэта, рэбэ, яны идуць раз ў гару, другi раз зыходзяць ў низ? Кали яны так жадаюць быць ў неби, чамуж яны там не застаюцца, але зноў назад зыходзяць на зямлю?“ Бэн-Маймон ўстрасянуў сваими белыми валасами, як лев, и адказаў: — „Каб яны заставались ў неби и не варочались на зямлю, дык тагды не былиб яны анёлами! У гары набираюць яны многа дабраты и розуму и зварочваюцца на дол, каб разсе-

на 24 гадзины. За гэты час палиция павинна ўсё тое зрабиць, што ей трэба па закону.

САМОУПРАЎЛЕННЕ.

Па тых нават землях, гдзе правицельства ставицца самым народам, упраўляець пад яго вокам ды ва ўсём зьвязана законами — и там правицельству адводзицца не ўся работа дзеля карысьци народу, дзеля здавалення патрэб яго. А па иншых дзержавах дык адведзена правицельству сусим мала месца ў народным жыцьцю. Бо ўжо кинем тое, што наняты за грошы чыноўник ня будзець николи вельми дбаць аб интэрэсах таго краю, гдзе ён пастаўлены служыць. Алеж нияк ня можэ здарыцца, каб якая управа, з кольку министроў зложэная, ды магла, як трэба, весьци гаспадарку ўсяе зямли. Ци то справа будзе аб утрыманню школ, шпиталёў, ци аб налажэнню справедливаго падатку, аб доглядзи за дарогами, помачы ў нешчасьцю або бедносьци, ци аб страхоўцы: ўсё гэта найлепей можна ўвесьци ды добра паставиць, кали сам народ будзе аб тым клапацицца.

Изноў жэж часта у адну дзержаву вайходзяць такие краи, каторые маюць сусим розные патрэбы, и ўсим им заводзиць адну гаспадарку ани як ня можна. Тутака жывуць хлеборобы, там — рыбаки, а то и пойдуць ўсё фабрычные мейсцы. Тольки им самым ды ведаць, якие палепшэння и парадки им патрэбны. Тады кожны край упраўляецца асобне и кожны сваим парадкам распадаецца на дробные управы. Упраўляецца сваими силами сяло, або вокруга, вяличыни як нашэ обчэства, а там и падходзиць пад воласць. Таким парадкам кольки дробных управоў вайходзяць у адну. Бо и выходзиць им брацца за такие справы, каторые кожнай не были бы пад силу; калиж ўзяцца за их дружне, злажыўшыся разам—лёгка даюцца. Выйдзе, напрыклад, будаваць масты, правадзиць дароги, завесьци страхоўку. Аднаму нашаму обчэству гэта, ведама, николи и не удалосябы. А нашчот страхоўки, дык яна тольки тады добра служыць народу, кали за яе чым больш людзей возьмецца. Тады ўсяки спадзевацца можэць, што ў нешчасьци ён магчыме дастаць помач.

Таки парадак, пры каторым сам народ у сваих руках трымаець свае справы, называецца самоупраўленне.

Ў Расеи, апроч нашаго краю, Польшчы и некаторых других губэрнёў, зараз за скасаваннем панщчыны было ўведзено самоупраўленне. Там яно завецца земства. Были ўведзены паветовые (вуездные) ды губэрнские земские управы. Яны складалися

ваци тые багацтва па зямли. И гдзе яны засеюць зямлю, там родзицца лепшае збожа, нима сварок, але шырыцца спакой, и людзи менш плачуць, болей цешацца. Вось дзеля чаго яны зварочваюцца на зямлю, хаця им гэта трудна прыходзицца, и дзеля таго, Бэн-Егуда, яны анёлы.“ — Бэн-Маймон перастаў гаварыць, а Бэн-Егуда и ўсе, што были там, цешылися и дзякавали яму за тое, што даў им такое пекнае абецанне. Бэн-Маймон спытаўся: — „Якое ж я даў вам абецанне?“ — А Бэн-Егуда адказаў: „Гэтые анёлы, рэбэ, зробяць некали, што на сьвеци ня будзець ўжо голаду, ни сварки, ни дурных, ни таких, што плачуць, што ў сэрцы сваим крычаць, што им вельми кепска!“

Але, мусиць, ня тольки Бэн-Егуда з Ешурум, а и далёки патомак яго, Гэдали з Волпы, вельми цешыўся абецаннем Раби-Маймона. Вяликая перамена зрабилася ў им. Ноги ў пакрыўленых и запыленых ботах моцна абпёр на падлодзы, падняў плечы, з каторых звешвались падзёртые рукавы. Твар падняў да столи, и яго сивая барада аттапырылася, быццам серабрыстае скрыдло. Блыск агню падаў яму на лоб, асьвечваючы на им моршчыны, але з блишчастых вачэй так и било вяликае задаваленне

Разам адкрытую тонкую шыю Гэдаля абвила сильная маладая рука, а румяные губы, схилиўшыся над збарожджэным моршчынами лобам, выциснули на им моцны пацалунак. Зрабиў гэта Янук, каторы, ўстаўшы ад стала и падходзячы паволи да комину, з вяликим уважэннем прыслухваўся да апаведаннёў жыда, и цяпер, астанавиўшысь перад им, раптам кинуўся да яго, абняў яго шыю и пацалаваў ў лоб. Патым адышоў и, абпёршысь плечми на рог комина, стаяў з пахиленай галавою, чырвоны, як бы засаромаўпысь. Нешта ў хлапцу загаварыла: ци вяликае злитаванне над бедным чалавекам, што с такой верай гаварыў аб збаўцах сьвету? ци шчырае каханне людзей-анёлоў? ци неякая надзея, што, можэ, сам кали-небудзь будзе таким анёлам?...

(Далей будзе.)

з выбарных ад усяго народу, ад усих роўна: ад двараноў, мужыкоў ды других „сасловьёў“. Такие управы не служыли интэрэсам аднаго якога „сасловья“, але ўсим роўна. Таму яны и звалися „безсаслоўными“. Тольки не спадабалися яны правицельству, бо выходзило, бытцам таким парадкам пойдзе па ўсей дзержави праўдзивая народная управа, народ будзе па сабе, а власць чыноўникоў — па сабе. Страшна зрабилося, каб не здумаў народ збывацца их заўсим. Гэтак ў 1890-м гаду были ўведзены ў земски строй Расеи вяликие парамены. Паменшыли личбу выбарных, устанавили выбары ўжо саслоўные. Ў кожным павеци выбарных ад мужыкоў ды мешчаноў назначэна па стольки, каб их менеў было ад дваранских. Дый то з их губэрнатор яшчэ дабирае па сваим гусьце, хто яму болей спадабаецца. Што бы ни пастанавила управа, тое не мае силы, пакуль не пацьвярдзиць правицельства. А ешчэ шмат справоў земства страцило права парадкаваць, бо яны были аддадзены земским начальникам; напрыклад, догляд за абчэственымі магазынами, за расходами хлеба. Министэр Виттэ даводзиў, што самоупраўства чыноўникоў быць ня можэ пры народным самоупраўленни. Дзеля таго земства па троху и были падведзены пад апеку чыноўникоў, а власць народу над сваёй жэ гаспадаркай заўсим зменшылася.

Земскае упраўленне будзець незадоўга ўведзена и у нас, алеж так сама па закону 1890-го году. Рэч тут ясная, што гэтые управы знарок так пароблены, каб падвесць их пад каманду багатшых ды чыноўникоў. Калиж мы пагледзим, якое самоупраўленне ёсць па иншых гасударствах, — дык часта убачымо, што яно там чыста народнае ды як належыць служыць народу. Выбирае туды людзей сваих ўвесь той народ, што жывець у границах такой управы (часам и кабеты), дый пасылаюць выборнаго проста ў сваю управу, а не так, як у Расеи, гдзе выбираюць яго пастаноўленые для гэтаго сходами выбаршчыки. Таким правам, и багатыр, и беднейшы — ўсе маюць роўную силу ў народных справах. Выбары так устаноўлены, каб ня мог хилиць гаспадар свайго работника або начальник свайго служашчаго, куды захочэць, бо кожны ўписуе прозьвишчэ выборнаго ды, запечатаўшы, ўкидаець у скрынку для падрахунку. Гэтакая управа не ляжыць сваей цяжэсцью на беднейшых: тады и падатки бяруцца так, каб больш плациў той, хто багатшы ци зямлёй, ци грашми; а на малы скарб, што як гаспадару пражыць, дык заўсим не ускладаюцца. Тады ёсць надзея чалавеку здольнаму за памочаю свае управы дайсьци да патрэбных яму наук. Будзе кожны пэўны, што, на выпадак яких апалоў, паддзержка яму прысьпеець. А самоупраўленне народу, пачаўшы ад самаго малога обчэства або сяла, заняўшы паветы, губэрни ды краи цэлые, паставиць гэты народ гаспадаром свайго жыцця и не дасць над им панаваць чыноўникам.

Дык вось и нам патрэбна гэтакое самоупраўленне.

Марцин.

З Беларуси и Литвы.

(ад нашых корэспондэнтоў).

Докшыцы, Минскай губ. Нядаўна ў нашу Тамилоўскую воласць прыехаў чорнасоценник з „саюзу рускаго народу“. Ен птушка вось якая: родам ён з нашай воласьци, з вёски Зарачыцку, паехаў ў Пецербург, прапиўся да шчэнту, два годы не даваў аб сабе весьци; маци спраўляла па им панихиду... Аж, дай, нячыстая прынясла яго, дый ўжо са знаком „чорнай сотни“, дый з ихними книжками и газэтками. Видаць — як никуды не прыймаюць и рабиць не ахвота — адна дарога ў „саюз исьцинна-рускаго народа“. Ци не прысланы ён тольки за казённые (саюза) грошы, каб нам, мужыкам, голавы задурыць? Вось, и давай ён свае книжки людзям торкаць (гэтых книжок и газэт и ў нашай канцылярыи, перапрашаючы, што у сабаки блох). Ну, прыйшоў ён на сход, давай хвалиць свой „саюз“ и кажэць: „наш саюз выгониць ўсих жыдоў и палякоў, бо ад их ўся беда“. А аб зямельцы для мужыка ды аб воли ани слаўца. Ведамаж, што гэты саюз граець ў адну дудку з графами дый з вяликими памешчыками и чыноўникамі. Думаюць яны, видаць, нацкаваць мужыка на жыда, а самым сесьци яму яшчэ мацней на шыю. „Пишыце, кажэць, прыгавор, каб Думу изноў разагнали, бо яна „крамольная“, дый пасылайце гэты прыгавор глаўнаму министру“. Выбарные маўчаць, як замазанные. Але знайшоўся таки чалавек; як гукнець ён на чорнасоценника: „Ашуканец ты! Видзели мы гэтаких исьцинных руских! Што вы яго слухаеце?“ Пачуўшы гэта, старшына не ўстрымаўся: „Маўчы, крычыць, не пярэшкаджай яму, а то ў халодную атпраўлю“. Перад сходам старшына ездзиў да земскаго и, видаць, намовился даць волю чорнасоценнику, дый палиция яго не чэпаець, ци ня маець и на гэта бумаги? А добрага чалавека даўно заперлиб пад замок. Назаўтра пьяны старшына лётаў па сяле и напрашаў, каб не казали ничога на перакор чорнасоценнику. Прыгавору проциў Думы, апроч писара, памоцника и аднаго старосты, нихто не падписаў. Мужыки прамеж сябе гавораць: ци мы адурнели, ци у нас дзяцей нима, што мы будзем падписываць брэхню чорнасоценникоў з саюзу. Ждали мы вашэй ласки

доўга, и цяпер Дума аб нас падумаець, а вас прасиць ня будзем. **П.**

Сяло **Микалаеушчына,** Минск. губ. и павета. 25 марца ў нашае сяло прыежджаў аратор. Сабралося ўсё сяло паслухаць, што ён будзе гаварыць. Але к чэсьци нашых микалаеўцоў трэба сказаць, што яны добра умеюць распазнаць чалавека ад „гузика“ и „каўнера“ Дык ня дзива, што аратара нашы людзи слухали лепш, як папа ў цэркви. А гаварыў малады аратор многа и надта складне, гаварыў пра зямлю и пра свабоду. Нарэсьци написали ў Гасударственную Думу наказ, каб дабивалися зямли и свабоды, каб трэбовали амнэстии (прашчэння), скасавання ваенно-палевых судоў и смертнай кары. Ў гэтым наказе не пахвалили микалаеўцы и сваих минских дэпутатоў.

А палиция, пачакаўшы, пачула звон, ды ня ведае, гдзе ён. Знае, што быў аратор, што нешта писали, падписывалися ня тольки мушчыны, а и дзеўчаты. А што писали, дык ня ведаюць.

Недаўна прыехали па гэтаму дзелу стражник и жандар. Сабралася куча народу. То той, то други з грамады гавораць аб цяжкай доли.

— Што вы мне гаворыце гэта?— Пытае жандар: — жандарскаму палкоўнику нема да гэтаго дзела.

— Дык чагож ён тутака хочэ, кали яму нема дзела?! Крычыць адзин.

— А гдзе вы дзеецe свае грошы, што их у вас нема? — пытае и стражник.

— На вас аддаем! — Крычыць други и падбивае пад локаць суседа: „Гавары и ты! Чаго ж ты маўчыш, карова! Ты ж Турцию забираў (сусед быў на вайне ў Турэчыне), а ён што, джугар (ёрш) гэты? Ад японца уцекаў!“

Над сьмех и жарты селян палиция пакидае сяло. **Микалаевец.**

= Не вельми даўно у нас было следства па дзелу аб вучыцельским саюзе. З вучыцелёў, што да таго саюза належэли, ўзяли падписку, каб никуды не выежджали без дазвалення палиции. Абвиняюць па 126 ст. па першай часьци. Ешчэ не зьняли дапросу са ўсих сяброў. Ў летку, як видаць, будзе суд. **Я. К.**

Полоцк, Вит. губ. Вучэники вучыцельскай сэминарыи стали дабивацца лепшых варункоў ў сваим жыццю и навуцы. Акром таго, яны не хацели есьци поснай стравы. Тагды папячыцель вучэбнай вокруги барон Вольф распарадзиўся закрыць сэминарыю да восяни, а 12 вучэникоў выгнаў саўсим. И хлопцы, што неўзабаве будуць народными вучыцелями, разъехалися да бацькоў з смутным сэрцэм: цяжка яшчэ дабивацца у нас права и праўды. Але здаецца, што новые вучыцели ня будуць такими зацисьненымі и баязьливымі, як старые.

Сэминар.

Маладэ́чна. Тут з вучыцельскай сэминарыи выгнали двух вучэникоў. Начальства их винавациць ў тым, што бытцам яны зрабили саюз чатырох сэминарый: Полоцкой, Маладэчэнской, Свислочской и Поневежской. **Т.**

З **Лидзкаго павету.** Каля нас недаўна згарэла вяликая вёска Солишки, ў каторай было 112 гаспадароў. Яны маюцца прасиць дроў на будынки з казны, але няведама, ци дастануць. **А. Б.**

З усих старон.

Ў горадзе **Уржуме, Вятскай** губ., палиция арыштавала хлопчыка дванаццати гадоў, як палитычнаго праступника Тольки цераз тыдзень страшэны „гасударственны праступник“ быў выпушчэн з турмы пад надзор палиции. (Волж. Пр.)

Земские начальники Чэрнигаўской, Воронежской и Харькоўской губернёў даносяць губэрнаторам, што сярод мужыкоў рух проциў стражникоў робицца ўсё большы и большы. Мужыки састаўляюць прыгаворы аб высылцы стражникоў ў Сыбир. Па ўсех губернях каля Волги многа стражникоў бягуць з сваих месцоў. (Вит. Гол.)

14 мужыцких дэпутатоў, каторые личылися да гэтаго часу ў партыи монархистоў, падали заяўленне, што яны болей да гэтай партыи не належаць, бо гэтая партыя дабиваецца тольки таго, каб разагнали Думу. (Вит. Гол.)

Тыфлис. Свящэник Татаришвили выказаў сваи думки, што трэба адмяниць кару сьмерци. За гэтае свяцейшы сынод пасадзиў яго пад арэшт ў манастыр. (Рѣчь.)

Одэсса. Чорнасоценники забили колькі рабочых. Перш их арыштавали, але зараз выпусьцили. Ўсе чорнасоценники маюць рэвольверы, и палиция их не адбирае. (Рѣчь).

Нижни Новгород. Ў летку, ў 1905 гаду, шэсць чорнасоценных мужыкоў зрабили ў горадзе разбой. Напаўшы разам з другими хулиганами на сабранне социал-дэмократоў, яны потым стали ўрывацца и ў люцкие дамы, пабили болей як 40 чалавек и многа чаго пакрали. Некаторые с пабитых памерли. Акружны суд прыгаварыў лишыць их ўсех правоў и пасадзиць ў турму на 8 месяцоў. Сэнат уцьвярдзиў той прыгавор. Нядаўна цар гэтых людзей памилаваў. (Рѣчь.)

Полтава. Было тут такое здарэнне. Двое казакоў, Назароў и Ротоў, зайшли ў вечар да крамки Макоўскаго, адабрали ў яго 8 рублёў, а яго самаго задавили вяроўкаю. Надышли людзи и схапили их на месьце. Суд прыгаварыў их на 15 гадоў катарги. Цяпер им кару гэтую збавили. (Рѣчь.)

Казаки станицы **Новочэркасскай** саставили прыгавор ў Думу. У гэтым прыгаворы яны трэбовали ўсех гражданских правоў, зямли и волi, амнэсьтии (прашчэння) палитычным праступникам и аддачы ўсяе зямли на агульнае карыстанне. Начальства гэты прыгавор атабрала, а шмат казакоў, падписаўшых прыгавор, арыштавала. Тагды казаки на сотнях падвод зъехалися да горада Новочэркасска и стали разбираць обчэственнае сено. „Власьци“ перапалохалися и выслали проциў их конных казакоў, але конные казаки ани варухнулися. (Рѣчь.)

Рэдактор-Выдаўца А. Ўласоў.

Друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 4.